## *ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ*

# СЦЯПАН ГАРДЗЕЕВІЧ СКАРАПАНАЎ

**(Да 85-годдзя з дня нараджэння)**



Сцяпан Гардзеевіч Скарапанаў нарадзіўся 7 лістапада 1910 г. у вёсцы Бацвінава Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і селяніна-бедняка. Яго працоўная дзейнасць пачалася з дзесяці гадоў. Быў парабкам, працаваў у Гомелі на цагельным заводзе, вучыўся ў вячэрняй школе. У 1929 г. узначальваў Мяркулавіцкі сельсавет, а праз два гады (1931) паступіў у Беларускі сельскагаспадарчы інстытут. Атрымаўшы дыплом у 1936 г., С. Г. Скарапанаў працягваў вучобу ў аспірантуры, адначасова чытаючы лекцыі ў інстытуце і ў землеўпарадкавальным тэхнікуме, загадваў доследным полем.

За тры месяцы да заканчэння аспірантуры С. Г. Скарапанаў быў прызваны на абавязковую ваенную службу. 16 красавіка 1940 г. салдат 329-га зянітна-артылерыйскага палка на вучоным Савеце БСГА паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю. Малады кандыдат навук марыў хутчэй адслужыць і праз два гады вярнуцца да любімай справы. Аднак вайна зблытала ўсе планы: замест двух арміі аддадзена сем гадоў.

У кастрычніцкія дні сорак першага года парторг палка салдат Сцяпан Гардзеевіч Скарапанаў у саставе 367-га супрацьтанкавага палка адпраўляецца пад Мажайск. За праяўленую мужнасць узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і медаллю «За абарону Масквы». Потым былі Ленінградскі фронт і другі баявы ордэн Чырвонай Зоркі і медаль «За абарону Ленінграда», вызваленне Варшавы і ордэн Айчыннай вайны I ступені і медаль «За вызваленне Варшавы», штурм Берліна і медаль «За ўзяцце Берліна».

Пасля дэмабілізацыі з радоў Савецкай Арміі ў 1946 г. Сцяпан Гардзеевіч працаваў у Савеце па вывучэнні вытворчых сіл АН СССР у якасці навуковага супрацоўніка Арала-Каспійскай экспедыцыі. У красавіку 1948 г. ён пераведзены ў АН БССР намеснікам дырэктара, а з верасня 1948 да лютага 1959 г. (з двухгадовым перапынкам) з'яўляўся дырэктарам Інстытута меліярацыі, воднай і балотнай гаспадаркі АН БССР. У кастрычніку 1950 г. С. Г. Скарапанаў выбраны членам-карэспандэнтам АН БССР, а ў лютым 1959 г.— акадэмікам-сакратаром Аддзялення меліярацыі і лясной гаспадаркі Акадэміі сельскагаспадарчых навук БССР. У 1961 г. ён абараніў доктарскую дысертацыю.

Навуковыя інтарэсы С. Г. Скарапанава ахопліваюць шырокае кола

пытанняў па глебазнаўстве і земляробстве, лугаводстве і меліярацыі, экалогіі і эканоміцы. Ім асабіста і ў сааўтарстве па гэтых праблемах апублікавана больш за 600 арыгінальных і навукова-папулярных прац, у тым ліку 15 манаграфій.

У працах Сцяпана Гардзеевіча выкладзены тэхналагічныя асновы і практычныя прыёмы асваення і выкарыстання тарфяных глебаў (1961 г.). Ім распрацавана канцэпцыя меліярацыі зямель і аховы навакольнага асяроддзя (1982 г.), шэраг пытанняў тэорыі і практыкі пашыранага ўзнаўлення ўрадлівасці глебаў (1987 г.), даследаваны сацыяльна-экалагічныя вынікі інтэнсіфікацыі земляробства і шмат якія іншыя пытанні.

Распрацоўкі Сцяпана Гардзеевіча шматразова дэманстраваліся на Выставе дасягненняў народнай гаспадаркі СССР і ўдастоены залатых і сярэбраных медалёў. Манаграфія «Асваенне і выкарыстанне тарфяна-балотных глебаў», выдадзеная ў Мінску ў 1961 г., у 1968 г. была перавыдадзена на англійскай мове ў Іерусаліме. За выдатныя навуковыя дасягненні Сцяпан Гардзеевіч удастоены Залатога медаля імя В. Р. Вільямса (УАСГНІЛ) і медаля імя Э. Бауэра (ГДР).

Талент даследчыка, які спалучаецца з вялікай чалавечнасцю, увагай да маладой навуковай змены, з асаблівай сілай праявіўся ў падрыхтоўцы навуковых кадраў. Пад яго кіраўніцтвам падрыхтавана 12 дактароў і 36 кандыдатаў навук, якія развіваюць ідэі свайго настаўніка. Шмат якія з іх добра вядомыя ў навуковым коле і ў вытворчасці: доктар эканамічных навук, прафесар, член-карэспандэнт УАСГНІЛ К. А. Пурвінскас паспяхова ўзначальвае Літоўскі інстытут камп'ютэрных сістэм (цяпер ён саветнік Прэзідэнта Літвы), доктар сельскагаспадарчых навук У. П. Самсонаў выбраны акадэмікам ААН, кіруе Беларускім інстытутам земляробства і кармоў, доктар навук П. І. Балзаравічус — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР — больш за 25 гадоў з'яўляўся дырэктарам Літоўскага інстытута меліярацыі. Доктар навук К. А. Шпогіс выбраны членам-карэспандэнтам Акадэміі навук Латвійскай ССР, а М. М. Бамбалаў — акадэмікам АН Беларусі.

Навуковая дзейнасць Сцяпана Гардзеевіча цесна звязана з кіруючай і дзяржаўнай працай. Амаль 11 гадоў (1961—1972) ён — Міністр сельскай гаспадаркі Беларускай ССР. За гэты час валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі рэспублікі ўзрасла ў 1,4 раза, вытворчасць збожжа больш чым падвоілася, а ўраджайнасць збожжавых культур павялічылася з 8,3 у 1961 г. да 21,4 ц/га ў 1971 г. Падтрымлівалася цесная сувязь навукі з вытворчасцю.

Навукова-тэхнічны прагрэс, узрастанне ролі навукі абумовілі неабходнасць арганізацыйнай перабудовы працы Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя У. І. Леніна, што знайшло сваё адлюстраванне ў стварэнні яе рэгіянальных аддзяленняў. У ліку іншых было створана і Заходняе аддзяленне УАСГНІЛ, якое з 1972 да 1976 г. узначальваў Сцяпан Гардзеевіч. За кароткі час ён здолеў накіраваць намаганні навуковых устаноў Беларусі, Літвы, Латвіі і Эстоніі на вырашэнне каранных праблем інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці.

Каля трох гадоў Сцяпан Гардзеевіч узначальваў Аддзяленне земляробства і хімізацыі (УАСГНІЛ), дзе праявіў сябе буйным арганізатарам навуковых калектываў.

Шырока вядома дзейнасць С. Г. Скарапанава на розных міжнародных з'ездах, канферэнцыях, сімпозіумах. Ён неаднаразова дастойна прадстаўляў рэспубліку ў Камітэце па сельскай гаспадарцы ЕЭК у Жэневе, узначальваў дэлегацыю Савета калгасаў СССР на сустрэчы лідэраў сялянскіх партый і арганізацый Еўропы ў маі 1972 г. у Сафіі, якая была прысвечана праблеме «Сяляне Еўропы ў барацьбе за мір».

С. Г. Скарапанаў неаднаразова выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, доўгія гады быў членам прэзідыума АН БССР, УАСГНІЛ. Шмат гадоў ён з'яўляўся намеснікам старшыні рэспубліканскага праўлення таварыства «Веды».

Па ініцыятыве С. Г. Скарапанава ў 1963 г. заснаваны часопіс «Весці АН БССР» (серыя сельскагаспадарчых навук). Чвэрць стагоддзя (1963—1987) акадэмік С. Г. Скарапанаў — галоўны рэдактар гэтага часопіса.

Сцяпан Гардзеевіч прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь. Ён выбраны членам Прэзідыума Акадэміі. Яго эрудыцыя, шматгадовы жыццёвы вопыт, энергічнасць і высокая актыўнасць ініцыіруюць нямала прагрэсіўных ідэй.

За заслугі перад Радзімай юбіляр узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны 1 ступені, Чырвонай Зоркі, «Дружбы народаў», «Знак Пашаны», сямнаццаццю медалямі, пяццю Ганаровымі Граматамі Вярхоўнага Савета БССР, дванаццаццю медалямі ВДНГ СССР, у тым ліку чатырма залатымі і адным сярэбраным, дзесяткамі падзячных грамат навуковых і грамадскіх арганізацый.

Ён з'яўляецца акадэмікам акадэміі навук Беларусі, акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь, УАСГНІЛ, акадэміі сельскагаспадарчых навук БССР, Рассельгасакадэміі, членам-карэспандэнтам Акадэміі сельскагаспадарчых навук ГДР, заслужаным дзеячам навукі БССР, доктарам сельскагаспадарчых навук, прафесарам, ганаровым старшынёй Заходняга аддзялення УАСГНІЛ, ганаровым прафесарам БСГА, ганаровым членам Вучонага Савета БелНДІЗіК.

Сваё 85-годдзе акадэмік С. Г. Скарапанаў сустракае поўным сіл, творчай энергіі і праектаў.

Нізкі паклон, прызнанне і ўдзячнасць юбіляру. Пажадаем яму моцнага здароўя, даўгалецця і далейшых поспехаў у навуковай і грамадскай дзейнасці на карысць народа.

*В. Ф. САМЕРСАЎ, У. А. ШЧАРБАКОЎ*